# ФОРМЫ І МЕТАДЫ ПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ НА СОЙМІКАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**Г. А. Мамрыкава**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік С. А. Юрыс, канд. гіст. навук, дац.

У любым грамадстве існуе палітычная барацьба розных сацыяльных слаеў насельніцтва. Яе формы і метады дыктуюцца не толькі гістарычным часам, да якога належыць разглядаемае грамадства, але і традыцыямі, назапашаннымі у ходзе яго развіцця. Яркія прыклады палітычнай барацьбы дае нам дзейнасць павятовых соймікаў ВКЛ.

Перадсоймавыя соймікі, утвораныя паводле кароннага ўзора ў адпаведнасці з бельскім прывілеем ад 30.12.1565 г. і юрыдычна санкцыянаваным II Статутам ВКЛ, увайшлі пасля Люблінскай уніі ў парламецкую сістэму Рэчы Паспалітай у нязменным выглядзе. Такім чынам, ад 1569 г. на абшары Вялікага княства Літоўскага збіраліся 22, а пасля вызвалення Смаленшчыны з-пад маскоўскага панавання – 24 павятовыя соймікі [1, с. 77]. Паколькі закон казаў толькі пра перадсоймавыя соймікі, то ўсялякія іншыя з’езды соймікамі не называліся. Таму існаваў супраціў іх скліканню перад іншымі соймамі, літоўскімі канвакацыямі, генеральнымі з’ездамі перыядаў бескаралеўства.

Шмат пакаленняў даследчыкаў стараліся апісваць і класіфікаваць соймікі, грунтуючыся на іх кшталце, кампетэнцыі, назвах. Толькі 30 гадоў таму назад Адам Літынскі выступіў з тэзаю, што соймік быў адзін, а разнастайных з’ездаў было багата, і назвы іхнія вызначаліся якраз іхнімі функцыямі. Вальнаму сойму павінны былі папярэднічаць соймікі ў паветах, якія склікаліся каралеўскімі універсаламі сама менш за шэсць тыдняў перад яго адкрыццем, прычым яны павінны былі трапіць да ваяводаў і судовых старастаў за два тыдні перад соймікамі.

Напэўна, нярэдкімі былі выпадкі, калі мясцовыя эліты і нават самі судовыя старасты не былі зацікаўлены ў шырокім розгаласе пра набліжэнне соймікаў і абмяжоўваліся інфармаваннем пра іх толькі сваіх паплечнікаў. У гэтых выпадках універсалаў або зусім не публікавалі, або публікавалі толькі вельмі абмяжавана. Пра соймік, такім чынам, шляхта даведавалася толькі перад самым яго адкрыццем або ўжо пасля заканчэння.

III Статут ВКЛ надалей прадугледжваў абавязак удзелу ў сойміках усіх грамадзянаў – кожнага ў сваім павеце, прычым гэта тычылася і біскупаў, ваяводаў, кашталянаў і разнастайныхураднікаў [2, с. 42]. Было пацверджана права соймікаў займацца не толькі справамі, якія прапанаваў ім кароль у інструкцыях, але

і мясцовымі. Яны не маглі працаваць даўжэй за 4 дні, але ўсе павінны былі з'явіцца на іх ужо ў першы дзень і засядаць і галасаваць згодна з усталяваным парадкам. Кожны павет меў права выбраць па двое паслоў на сойм, але толькі аднагалосна. Гэтыя паслы павінны былі атрымаць ад сойміка інфармацыю, пацверджаную пячаткамі ўдзельнікаў, як паводзіць сябе ў даручаных ім справах, і права прымаць рашэнні ў гэтых пытаннях.

Падрыхтоўка соймікавых універсалаў ляжала на канцылярыях, прычым згодна са звычаем пытанні гэтыя падлягалі кампетэнцыі канцлера, і толькі ў выключных выпадках пераходзілі ў кампетэнцыю падканцлера. Часам уся лагістычная праца выконвалася персаналам караля, а канцылярыі толькі перапісвалі дастаўленыя ім узоры лістоў, без права ўмяшання ў іх.

«Лімітаванне» паседжанняў – адзін са спосабаў змены тэрміну сойміка без таго, каб кароль канечне павінен быў склікаць яго паўторна. Не заўседы, аднак, шляхта пагаджалася пераносіць паседжанне з прычыны «запозненых граматаў», хоць нярэдка гэта была зручная нагода, каб сарваць іх.

Для правядзення соймікавых з'ездаў кожны павет меў свае традыцыйнае месца. Найчасцей гэта была ягоная сталіца, дзе, як правіла, канцэтравалася ўсе грамадскае жыцце. Было, аднак, некалькі адміністрацыйных адзінак, у якіх з прычыны месцазнаходжання і юрыдычнага статуса сталічнага горада гэтае грамадскае жыцце адбывалася ў іншым месцы. У трох паветах Наваградскага ваяводства толькі ў выключных выпадках соймікі не адбываліся ў павятовых цэнтрах. Віцебскае ваяводства з прычыны свайго пагранічнага месцазнаходжання было ў небяспецы маскоўскіх наездаў, і тады віцебскія і аршанскія соймікі і суды збіраліся па-за граніцамі гэтых паветаў – напрыклад, віцебскія ў Нясвіжы (1655), Бездзежы (з 1658), Слоніме (1662), а аршанскія – у Чарэі або Менску (1655), Кобрыне (1658).

Паколькі ніякі закон не прымушаў шляхту браць удзел у сойміку свайго павета, цяжка вызначыць, наколькі масавымі яны былі і які працэнт грамадзянаў браў удзел у іх. Асабліва ўважаючы на тое, што ўладальнікі маенткаў у розных паветах мелі свабоду выбару сойміка, а палітычныя гульцы не заўседы былі зацікаўленыя ў надзвычайнай мабілізацыі шляхты да прыбыцця на іх. Штопраўды, літоўскія статуты дакладна вызначалі, што ў сойміках можа браць удзел толькі шляхціч, прычым такі, які валодае нерухомасцю ў дадзеным павеце, але гэтыя нормы – як і шмат якія іншыя пастановы – строга не выконваліся.

Функцыя асобы, якая адкрывала соймік, была важнаю, бо такі чалавек мог дастаткова самастойна паводзіць сябе ў справе элекцыі маршалка ўласна для паседжанняў, або нават адразу скончыць соймік. Таму важна было сачыць за найвышэйшым паводле рангу ўраднікам у ваяводстве ў дзень, прызначаны для сойміка, а таксама завабіць яго ў сваю фракцыю.

Такім чынам, пытанне выбару дырэктара на ваяводскіх сойміках не было ў ВКЛ юрыдычна ўрэгулявана, а спасылка на звычаі не заўседы давала станоўчы вынік, хоць у дачыненні да павятовых маршалкаў у прынцыпе трымаліся звычаевага права. Функцыі маршалка былі надзвычай важныя для ходу сойміка, бо ен валодаў вялікімі фармальнымі правамоцтвамі, якія часта пашыраліся нефармальнымі прывілеямі, здабытымі рознымі захадамі або сілаю [1, с. 122].

Шляхта тады магла адбіраць дырэктара і найчасцей так і рабіла, але не заўседы – часам узяць на сябе старшыняванне прасілі асобу, якая карысталася аўтарытэтам або не будзіла рознагалоссяў. Гэта, напэўна, быў вынік трыдыцыйнага падыходу да праблемы- рашучая перавага аддавалася пазбяганню элекцыі шляхам галасавання. Відавочна, бывалі выпадкі, калі ніхто не хацеў прымаць прапанову весці

паседжанне, і тады адбываліся нармальныя выбары праз галасаванне. Уплывовым павятовым дзеячам тады ўдавалася правесці ў дырэктары нават нетытулаванага шляхціча, нягледзячы на прысутнасць не толькі шмат каго з павятовых службоўцаў, але і сенатараў. Таму на ўсякі выпадак гэтых мясцовых шляхецкіх лідэраў імкнуліся абясшкодзіць – здабыць іхнюю прыхільнасць ласкаю, падкупіць, застрашыць або выключыць з паседжання. Здаралася і такое, што «насуперак закону і прынятым звычаям да абрання пададзена некалькі іх міласцяў паноў дырэктараў», і кожны з іх на гвалт, не зважаючы ні на якія галасаванні і пратэсты, маючы падтрымку ў сваіх прыхільніках, лічыў сябе дырэктарам, раздаваў галасы, перакрыкваючы канкурэнтаў, што ўрэшце вяло да зрыву паседжанняў з усімі наступствамі гэтага.

Пасля заканчэння фармальнасцяў з выбарам маршалка сойміка прыступалі да дэбатаў па сутнасці на падставе легацыі, прадстаўленай каралеўскім паслом. Функцыі пасла выконвалі вельмі розныя асобы – часта каралеўскія сакратары і прыдворныя, сыны мясцовых саноўнікаў, самі земскія службоўцы, але часам на соймік прыбывалі толькі звычайныя пасланцы, якія аддавалі дакумент у рукі маршалку.

Такім чынам, на прыкладзе аналізу працы павятовых соймікаў мы можам прыйсці да высновы, што палітычная барацьба ў беларускім грамадстве адыгрывала важную ролю і па формах была дастаткова разнастайнай.

Літаратура

1. Рахуба, А. Вялікае княства Літоўскае у парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай (1569–1763) / А. Рахуба. – Мінск : Медысонт, 2008. – 424 с.
2. Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1989. – 572 с.